№2 2011



Маленькі рыцар Беззаганнай

Мы — будучыня

У першы дзень лета, які мы штогод так нецярпліва чакаем, у свеце адзначаецца **Дзень абароны дзяцей**. Гэта значыць — наш дзень. А ад каго нас трэба абараняць? Хіба па вуліцах гарадоў ці вёсак блукаюць дзікія звяры, што кідаюцца на дзяцей? Ды не, драпежнікаў нібы і няма, а тым часам небяспекі — хоць адбаўляй.

Хтосьці з нас баіцца захварэць. Значыць, дарослыя імкнуцца абараніць нас ад хваробаў. У кагосьці няма чаго есці, і тады тое дзіця трэба накарміць. А калі хлопчык альбо дзяўчынка – ратуй, Божа! – трапілі ў аварыю, то іх трэба абагрэць, прытуліць, супакоіць...

Кожнага дня з намі штосьці здараецца. І часам, на жаль, здараецца нядобрае. А паколькі мы яшчэ малыя і не можам самі за сябе пастаяць, то дарослыя і прыдумалі назваць першы дзень лета Днём дзіцяці. Дзеля таго, каб звярнуць сваю ўвагу на тое, што мы, дзеці, іхняя будучыня, а яна мусіць быць шчаслівай.


Найцяжэй, вядома, калі дзяцей трэба абараняць... ад іхніх жа бацькоў. На вялікі жаль... Але спадзяюся, такога не здараецца з нашымі чытачамі. Ва ўсялякім разе, мне вельмі хочацца ў гэта верыць, і я штодня малюся за гэта.

Пане, падтрымай нас,
калі спатыкнемся,
падымі, калі няўзнак упадзем.
Вызвалі, калі зло прыгняце,
а калі ад дабра адвернемся, —
змяні нашы сэрцы, бо яны Твае.

Маленькі рыцар Беззаганнай







Данута Бічэль

ЦУД

Буслік нёс падарунак з нябёс
Ды паклаў асцярожна ў авёс.

Белы птах паляцеў бы далей...
Шнар крыві на белым крыле...

Каласы ціхі ветрык гайдаў,
Нехта смелы ў калысачцы спаў.

Жанчына ішла па расе
Ды знайшла гэты скарб у аўсе.

І сказала так: «Мой ты сынок,
Сінявокі мой, як лянок!»

Віталі бабуля і дзед:
«Асілачак наш, добры дзень!»

Пад анёльскі нябесны спеў
Акуналі ў святую купель.

Дзякуй, Божа, за гэты цуд —
Ты мне выбраў мой родны кут!

«Маленькі рыцар Беззаганнай». № 2 (52)/2011 г.
Часопіс для дзяцей. Выдаецца на ахвяраванні вернікаў.
Заснавальнік: Мінска-Магілёўская архідыяцэзія Рыма-каталіцкага Касцёла ў РБ.
Часопіс зарэгістраваны ў Дзяржаўным рэестры сродкаў масавай інфармацыі за №904.
Рэдактар — Ірына Францаўна Жарнасек,
мастак — Галіна Хінка-Янушкевіч, камп'ютарная вёрстка — Алег Глекаў.
Адрас рэдакцыі: 220030, г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 1а.
Фармат 70Х90 1/16. Ум. друк. арк. 1,05. Наклад 4 000 экз. Заказ № 719/1.
Падпісана да друку 8.06.2011 г. Надрукавана ў «Друкарня Макарава і К» ТАА.
ЛП № 02330/0150429 ад 19.11.2008. Вул. Ф. Скорины, 40-211, 220141 г. Мінск.

Ёанна Кшыжанэк

Як старэйшы брат нёс малодшага

Пасля смерці маці хлопчык Караль жыў толькі з бацькам. Ягоны брат Эдмунд вывучаў медыцыну ў Кракаве і да хаты, у Вадавіцы, прыязджаў толькі на вакацыі і святы. Зазвычай Караль не мог дачакацца ягонага прыезду. У сшытку ён маляваў каляндар, потым закрэсліваў кожны дзень, які мінаў, і тым самым набліжаўся дзень прыезду брата.

Нарэшце той дзень надыходзіў. З самага ранку Караль сядзеў на двары і чакаў, калі на дарозе з'яўлялася братава постаць. І калі бачыў яе нарэшце, радасна крычаў штомоцы ды падскокваў:

— Ідзе! Ідзе! Прыехаў!

Што было потым? Не цяжка зда-



гадацца. Трое мужчын разам гатавалі смачныя стравы, елі і размаўлялі, размаўлялі... Эдмунд распавядаў пра тое, што дзеілася ў Кракаве, а Караль з татам — пра навіны іхніх Вадавіцаў.

Калі Эдмунд здаў апошні экзамен і стаў лекарам, то прыехаў перад пачаткам працы на даўжэйшы адпачынак. Каралевай радасці не было межаў. Яны насмажылі патэльню бульбы і яечню, а калі пачалі есці, зразумелі, што кожны з іх пасаліў яе. І ўсё ж яечня тая была на дзіва смачная!

Назаўтра ўсе трое вырушылі на Ясную Гару, каб падзякаваць Пану Богу за тое, што Эдмунд атрымаў прафесію медыка. У капліцы Маці Божай Чэнстахоўскай доўга маліліся, удзельнічалі ў святой Імшы. Потым гулялі па горадзе, і хоць у Караля моцна разбалеліся ногі, але ён цярпеў тую стому з усіх сілаў. Эдмунд кідаў раз-пораз запытальныя позіркі на малога, але той маўчаў. Нарэшце брат запытаў:

— Караль, можа ты не супраць, каб я паднёс цябе, як носяць барана?

Караль ні хвілінкі не супраціўляўся, але з радасцю залез на падстаўленыя братавы плечы і ўжо з вышыні іх абвясціў:

— Цудоўна гэта — мець старэйшага брата!

— Малодшага таксама добра мець, — засмяяўся Эдмунд у адказ.

А тата, які прыслухоўваўся да іхняй размовы, падсумаваў:

— Добра мець двух такіх сыноў!

Усе пераглянуліся і пырснулі радасным смехам.

Канікулы мінуліся вельмі хутка. Надышоў час развітання, і Эдмунд паехаў у Бельск, дзе атрымаў працу...

Пераклад
з польскай мовы І.С.

Дзякуем за Папу Рымскага Яна Паўла ІІ

Прайшло шмат гадоў пасля тае гісторыі. Вядома, ні Эдмунд тады, ні тата не маглі прадбачыць, кім стане для свету іхні Караль. А ён вырас і стаў спачатку святаром, потым біскупам, а пазней — Папам Рымскім Янам Паўлам ІІ. І 1 мая 2011 года ўвесь Каталіцкі Касцёл дзякаваў Пану Богу за яго беатыфікацыю, якая адбылася ў Рыме. Мы ўсе ад гэтага дня маем яшчэ аднаго надзейнага заступніка ў небе. І ад гэтага дня можам прасіць яго ва ўсіх нашых патрэбах:

— Благаслаўлёны Ян Павел ІІ, маліся за нас!

МУЖНАСЦЬ — ГЭТА ДАР

«Інтэрв'ю» са святым Андрэем Баболем



— Святы Андрэй! Кажуць, ты быў вельмі мужны?

— Я, разумееш, Яська, не надта пра гэта думаў. Мяне больш займала тое, ці заўсёды я верны Хрысту, бо я ж належаў да закону Таварыства Езуса. Нібы тым самым назваўся Яго сябрам, а ў сяброўстве гэта заўсёды вельмі важна — быць верным.

— І табе заўсёды шчасціла быць верным?

— Я ж чалавек, Яська, і ў мяне таксама былі свае слабасці. Сорамна прызнавацца, але напачатку ў мяне быў даволі неўраўнаважаны характар. Я мог моцна раззлавацца на кагосьці, камусьці штосьці сурова выказаць.

— Ну а калі тыя людзі заслугоўвалі таго, каб з імі гаварыць такім тонам ці нават на іх накрычаць?

— Няма такіх людзей, Яська. І не было. Сказаць чалавеку праўду пра яго — гэта, вядома, трэба. Але ж рэч у тым, як сказаць! Калі з любоўю, без прыніжэння яго, то добра. А калі ты бярэш на сябе функцыі суровага выхаваўцы ці нават суддзі, то гэта ўжо зусім іншае.



— А дзе ты служыў?

— У Вільні і Варшаве, Бабруйску і Полацку, у польскай Ломжы і ў палескім Пінску.

— Я недзе чытаў, што цябе называлі душахватам. Але ж ты адшукваў тыя душы для Езуса!

— Вядома. Толькі ваяўнічым казакам гэта якраз і не падабалася. Таму яны мне і адпомсцілі.

— З незвычайнай жорсткасцю. Калі я чытаў, як цябе мучылі, моцна плакаў. І як ты толькі выцерпеў усе тыя мучэнні?

— З Божай дапамогай, вядома, бо сам сапраўды не змог бы вытрываць. Але ж Бог бачыць чалавечае сэрца, якое з усіх сіл імкнецца быць верным Яму. Бачыць і ўмацоўвае.

— Калі цябе мучылі, ты маліўся за сваіх мучыцеляў... Як Езус на Галгоце...

— Добра, Яська, што ты ўважліва чытаеш Евангелле і заўважаеш у ім такія важныя рэчы. Бо ў Евангеллі для нас ёсць навучанне не толькі, як нам жыць, але і як паміраць. І гэта таксама вельмі важна. Калі мы заўсёды будзем памятаць пра Крыжовы шлях нашага Збаўцы і Яго ўкрыжаванне, то не будзем тады пры любым выпрабаванні наракаць на лёс.

— Значыць, ты навучыўся мужнасці ў Езуса? А некаторыя мае сябры захапляюцца мужнасцю Тэрмінатара, Чалавека-павука ці яшчэ кагосьці падобнага.

— Такіх «герояў» у вашым часе сапраўды шмат, і я не дзіўлюся, калі ў вас часта кружыцца ад іх галава ды блытаюцца арыенціры. Таму і трэба заўсёды моцна трымацца галоўнага арыенціра — Езуса. Тады нічога не будзе страшна.

— Пастараемся. А ты, святы Андрэй Баболя, маліся, калі ласка, за нас у небе, каб мы былі мужныя і верныя Хрысту.

— Абяцаю. Толькі вы таксама нагадвайце мне час ад часу пра гэта.

— Ну так, сябры, будзем прасіць нашага шаноўнага госця: «Святы Андрэй Баболя, маліся за нас!»

Гутарыў
Яська Запытальнік



ЧАГО МЫ БАІМСЯ?

У нашым жыцці штодня здараецца столькі цікавага, вясёлага, радаснага! Але побач з усім прыемным існуе і тое, чаго мы баімся, што нас трывожыць, з чым бы мы не хацелі сустрэцца. І гэта таксама трэба ведаць, бо тады чалавек пачынае жыць так, каб пазбегнуць таго, з чым бы ён не хацеў спаткацца, альбо каб загартаваць сябе так, што ніякі страх яму не будзе страшны. Пра тое, чаго мы баімся, разважаюць сёння нашы чытачы з парафіі святога Антонія з Віцебска.



Я вельмі баюся трапіць у турму.

Аляксандр Замбжыцкі, 7 гадоў.



Я баюся, што нешта дрэннае можа здарыцца з маімі роднымі. А я іх так моцна люблю!

Уладзіслаў Рублеўскі, 11 гадоў.



Калі мы дапускаем шатана ў сваё сэрца, то пачынаем рабіць дрэнныя ўчынкі. Тым самым чынім грэх. Гэта і ёсць тое, чаго я найбольш баюся.

Станіслаў Бяляўскі, 12 гадоў.



Я больш за ўсё баюся ўколаў і жудасных сноў.

Ева Любенка, 7 гадоў.



Я баюся ўколаў і прышчэпак.

Давыд Любенка, 6 гадоў.



Мне страшна, калі на мяне сварацца бацькі за тое, што я іх не слухаюся. Баюся, каб не захварэў мой малодшы брацік... А яшчэ я баюся трапіць у пекла.


Каця Кімстач, 7 гадоў.


Я не маю адвагі быць адна ў цемры. А яшчэ я не хацела б сустрэцца на вуліцы з панкамі і вялікімі злымі сабакамі.

Вольга Шымко

Баюся цемры, павукоў, змей, прывідаў.

Павел Крупко, 9 гадоў.






Баюся ў сваім жыцці чужых і нядобрых людзей.

Вячаслаў Валюшка, 10 гадоў.

Больш за ўсё баюся сустрэць на вуліцы маньяка.

Мікіта Казачонак, 10 гадоў.



Адпачывайце і мяне не забывайце

Сябры! Пачалося сонечнае і радаснае лета. Вас чакае шмат цікавага, вясёлага, такога, чым, магчыма, вам захочацца падзяліцца з сябрамі, а то й з усімі чытачамі нашага часопіса. У вас ёсць такая магчымасць!

Напрыканцы лета, калі вы ўжо пабудзеце ў лагерах адпачынку, павандруеце там, дзе раней ніколі не былі, калі сходзіце ў пілігрымкі і загоіце мазалі на нагах, запрашаю вас усё ж узяцца за ручку ды паперу і напісаць нам. Раскажыце, што цікавага вы перажылі, што бачылі, дзе былі, каго сустрэлі.

Вашыя допісы і здымкі, а, магчыма, і малюнкі, мы пастараемся надрукаваць. Аўтар самага цікавага ліста альбо нечаканых, арыгінальных здымкаў атрымае прыз.

Чакаю вашых лістоў! Толькі не марудзьце, калі ласка. Апошні тэрмін вашых паведамленняў — да 20 жніўня 2011 года.

Маленькі рыцар Беззаганнай



Міністранты гуляюць у футбол

Турнір па міні-футболе на кубак біскупа Віцебскага Уладзіслава Бліна прайшоў у г.п.Дзісна, што Міёршчыне. У ім прынялі ўдзел міністранты з Міёраў, Дзісны, Глыбокага, Лучая. Парафія Беззаганнага Зачацця Найсвяцейшай Панны Марыі з Дзісны прадставіла на турніры дзве каманды: міністрантаў і каманду юнакоў Дзісненскага дзіцячага дома. Яны ж, дарэчы, і выйшлі ў фінал. А пераможцамі турніру сталі выхаванцы дзіцячага дома.

Шчасцю і радасці і футбалістаў, і






балельшчыкаў не было мяжы. Гэта была заслужаная перамога! Пасля ўручэння ганаровых узнагародаў удзельнікаў турніру чакаў смачны пачастунак.

На наступны дзень чэмпіёны прыйшлі на нядзельную святую Імшу і падзякавалі Пану Богу за свае таленты і магчымасць дзяліцца імі з іншымі. Дзісненскі дзіцячы дом наведаў біскуп Віцебскі Уладзіслаў Блін, які павіншаваў футбалістаў з перамогай і ўзнагародзіў дзяцей падарункамі.

Кс. Аляксандр Грыцкевіч.
Фота аўтара.





Ксёндз Ян Твардоўскі

Чаго баіцца д’ябал?

Д’ябал баіцца трох рэчаў.

Баіцца свянцонай вады, бо сам ён мурза і ніколі не мыецца.

Баіцца слова «Амэн», бо гэтае слова азначае: «Няхай будзе так, як хоча Пан Бог». А д’ябал жа наадварот – хоча, каб усё было па-ягонаму.

Баіцца слова «Аллелюя», бо гэтае слова азначае: «Радуймася: Пан Езус паўстаў з мёртвых! Пан Езус ёсць з намі!»

А д’ябал, тым часам, сумны, не хоча радавацца, адно толькі крывіцца ды ўвесь час робіць усё на злосць.

Нават суніцы чырвоныя
Хацеў бы ён змесці хвастом.

Ганна Старыковіч

Анёл-ахоўнік

Казка

Бог паклікаў да сябе Анёла і сказаў:

— Ідзі на Зямлю. Там зарадзілася новае жыццё. Цяпер ты будзеш абаронцам хлопчыка Юрыя.

Анёл паслухмяна спусціўся на Зямлю і адразу ж знайшоў жанчыну, якая нядаўна зацяжарыла. Спачатку ён павітаўся з яе Анёлам, таму што разам ім трэба было супрацоўнічаць доўгі час. Затым ён паглядзеў на хлопчыка, якога будзе ахоўваць, і той яму спадабаўся. Анёл зразумеў, што той вырасце прыгожым і разумным, а таксама таленавітым.

Анёл стаў паказваць хлопчыку рознакаляровыя сны аб яго будучым жыцці, аб тым, што калісьці адбывалася з яго мамай і татам. Ён паказваў яму ў сне жывёлаў і кветкі, і ўсё толькі прыгожае. Дзеля таго, каб дзіцяці было прыемна і ўтульна ў маці пад сэрцам.

Але аднойчы ледзь не адбылося няшчасце. Калі малому было ўжо сем месяцаў, мама з татам трапілі ў аўтамабільную аварыю. За некалькі секунд да сутыкнення з іншай машынай, не маючы магчымасці прадухіліць тое, што наканавана, абодва Анёлы раскрылі шырокія крылы і абаранілі маленькага Юрачку, які яшчэ не нарадзіўся, ад удару. Усё абышлося, і потым Анёл даўжэй, чым звычайна, паказваў хлопчыку рознакаляровыя малюнкі з катамі, сабакамі, коньмі і ягонымі ўсмешлівымі бацькамі.

Падчас родаў абодва Анёлы неадступна стаялі каля мамы, а калі маленькі Юра нарэшце з'явіўся на свет, Анёл ахінуў яго крыламі і прашаптаў: «Нічога не бойся, я з табой». Хлопчык адразу перастаў плакаць, супакоіўся і заснуў.

Анёл любіў забаўляць дзіця, калі яно ляжала ў калысцы або смактала малако з бутэлечкі, калі маці трымала яго на руках. Анёл кружляў у паветры, расхінаў і складваў крылы, а хлопчык радасна ўсміхаўся. Мама з татам нават не здагадваліся, што гэта так весяліць сына і за кім ён так уважліва назірае.

Аднойчы ў іх у гасцях была прабабуля хлопчыка. Яна паглядзела на дзіця, якое ўсміхалася, пазіраючы на сцяну, і сказала: «Анёлы ба-





вяцца». Анёл тады нават насцярожыўся: ці не бачыць яго бабулька? Але яна не бачыла, яна проста ведала.

Хлопчык падрастаў, і ў Анёла прыбаўлялася клопату. Аднойчы сусед неасцярожна скінуў кнігу з кніжнай паліцы. Анёл накрыў галаву Юркі крылом — і кніга праляцела міма. Другім разам хлопчык, калі ўжо самастойна хадзіў, спатыкнуўся і падаў проста на востры вугал шафы. Бацькі вярталіся з прагулянкі і былі яшчэ ў калідоры, а малеча, як заўсёды, вырваўся наперад... Ніхто, акрамя самога дзіцяці, не бачыў, як Анёл падхапіў яго і паставіў на ногі.

Уначы Анёл-Абаронца ахоўваў сон дзіцяці, не даючы, каб нехта злосны паказваў яму страшныя карцінкі. І з раніцы малеча заўсёды найперш бачыў менавіта свайго Анёла, размаўляў з ім, а бацькам заставалася толькі здагадвацца, з кім так радасна й шчасліва лапоча іх сынок.

Калі Юру споўнілася тры гады і ён быў адзін у пакоі, Анёл сказаў яму:

— Заўтра ты прачнешся і не ўбачыш мяне.

— Чаму? — спытаў хлопчык, складаючы сценку з кубікаў.

— Ты падрастаеш і ўжо добра размаўляеш. Ты можаш выдаць сакрэт нашага сяброўства.

— А ты пойдзеш да... Яго?

— Не, я застануся з табой і буду заўсёды ахоўваць цябе. Адно што ты больш не зможаш бачыць і чуць мяне. Але ты не бойся: я буду заўсёды побач з табой, а калі прыйдзе адпаведны час, я павяду цябе да Яго. Дай абдыму цябе на развітанне.

Малы шырока развёў рукі, і калі б хто-небудзь увайшоў у той момант у пакой, то падумаў бы, што дзіця абдымаецца з... паветрам.


Больш Юрка ўжо не бачыў такой звыклай і роднай усмешкі Анёла. І ён, вядома ж, не памятаў, што яшчэ да нараджэння сама Дабрыня аберагала і забаўляла яго. Такая ўжо ў іх служба, у нашых анёлаў — непрыкметная...



НАШ СВЕТ ПРЫРОДЫ



«Сонечная даліна» ў Крыме настолькі сонечная, што ажно вачам немагчыма ярка. Але цудоўна! Гэта можа пацвердзіць Мацвей Навойчык з Наваполацка. Калі ён прыязджае ў Крым разам з мамай, татам і сястрой, усе яны вельмі шчаслівыя. І нават мясцовыя крабы радуюцца Мацвееваму прыезду!



І мы ў гэтым свеце



Мінчане Ян і Марк Гародкі – браты. А яшчэ яны надзейныя сябры, і ім заўсёды добра быць разам. А калі Ян з Маркам выязджаюць адпачываць – іхняй радасці няма межаў. Як, напрыклад, у Клайпедзе, у гэтым цудоўным горадзе на беразе не менш цудоўнага мора!



З краёў далёкіх

У ВЯСЁЛКАВАЙ ІНДЫІ

Здагадваюся, сябры, што ўсе вы любіце падарожнічаць. Я, прызнаюся, таксама. Таму хачу падзяліцца з вамі сваімі незабыўнымі ўражаннямі ад леташняй паездкі ў Індыю. Дакладней кажучы, мы туды не ездзілі, а лёталі на самалёце, бо Індыя знаходзіцца ад Беларусі за тысячы кіламетраў.

Індыя нашмат большая за нашу краіну, і жыхароў у ёй прыкладна ў 120 разоў больш, чым у Беларусі. А яшчэ Індыя — гэта краіна сонца, там дзень вельмі доўгі, а ночы кароткія. А надвор'е такое спякотнае, што на поўдні, напрыклад, тэмпература ўлетку дасягае амаль +50°, а ўзімку рэдка паніжаецца да +24°! Самы аддалены ад Беларусі куток Індыі знаходзіцца амаль што над экватарам, і яго берагі абмывае Індыйскі акіян. Вада ў ім цёплая, нібы падагрэтая.



На беразе гэтага акіяна, у невялікім, паводле








індыйскіх меркаў, гарадку Вайланкані знаходзіцца каталіцкі санктуарый Маці Божай. Гэтак жа, як у Беларусі шмат вернікаў імкнецца наведаць святыню Маці Божай у Будславе, так у Індыі вернікі любяць храм Марыі ў Вайланкані. Уявіце сабе, што на галоўнай урачыстасці тут прысутнічае звычайна каля мільёна чалавек!

Ну а якое ж свята без дзяцей? Вядома, іх тут таксама бывае шмат. Прызнацца, у вочы кінулася тое, што індыйскія дзеці выглядаюць больш гарэзлівымі і адважнымі. Паколькі надвор'е ў Індыі спякотнае, то і дзеці, і дарослыя апранаюцца лёгка і проста. Вопратка індыйскіх вернікаў мае вясёлкавыя колеры, яна вельмі яркая. На Імшы дзеці заўсёды знаходзяцца ў першых радах, амаль пры алтары. Паводле шматгадовай традыцыі, з пашаны да святыні, у якой прабывае Бог, свой абутак вернікі пакідаюць на касцёльным пляцы, а ў святыню ўваходзяць босыя. Напачатку гэта было нязвыкла, а потым нават і спадабалася.

Хлеб у Індыі замяняе рыс, які расце блізка ад вадаёмаў. Ягоны ўраджай тут збіраюць тры альбо чатыры разы ў год. Індыйскія харчовыя крамы перапоўненыя экзатычнымі фруктамі: тут на кожным кроку ўбачыш манга, памэла, какосы, ананасы, бананы, ківі, авакада і шмат іншых фруктаў, якія, на жаль, не растуць у нас. Але затое для Індыі з'яўляюцца экзотыкай яблыкі і грушы. Іх сюды прывозяць у асноўным з еўрапейскіх краінаў, і каштуюць яны вельмі дорага.

Не ўбачыш у Індыі і беларускіх бярозак ды соснаў, затое там паўсюль высяцца пальмы, шмат бананавых плантацый, эўкаліптаў, імбіру, а таксама іншых дрэваў і раслінаў, якіх не сустрэнеш у нас. Як здагадваецеся, сябры, у гэтых экзатычных раслінах і дрэвах жывуць не беларускія сінічкі да салаўі, але вялікія і маленькія рознакаляровыя індыйскія папугаі. Праўда, паразмаўляць з імі не давялося. Мабыць, галоўная прычына ў тым, што мовы нашыя вельмі розныя!..



І ведаеце, пра што думалася мне ў Індыі? Найбольш пра тое, што мы, беларусы, у многім, вядома, адрозніваемся ад жыхароў Індыі. Але ёсць тое, што нас моцна яднае, — вера ў Бога. Значная частка жыхароў Індыі ведае і любіць Езуса Хрыста і Яго Маці. Таму з гэтымі людзьмі нас яднае так шмат!

Айцец марыянін
Міхаіл Цвячкоўскі



Спасланне Святога Духа

Кніга Дзеяў святых Апосталаў
Раздзел 2, вершы 1–4

Калі настаў дзень Пяцідзясятніцы, усе былі разам на адным месцы. І раптам узняўся шум з неба, нібы павеў моцнага ветру, і напоўніў увесь дом, дзе сядзелі яны. І з'явіліся ім языкі падзеленыя, быццам ад агню, і затрымаліся на кожным з іх. І напоўніліся ўсе Духам Святым, і пачалі гаварыць на іншых мовах, як Дух даваў ім прамаўляць.





Радасць і святло

Ад таго дня, калі Езус благаславіў іх і ўзнёсся ў неба, Маці Божая і апосталы трывалі на малітве і чакалі Суцяшыцеля, якога Ён абяцаў ім паслаць. Нялёгка гэта — маліцца некалькі дзён запар. Але яны не адступаліся, бо моцна верылі свайму Настаўніку. Яны верылі ў тое, што для Бога няма немагчымага, верылі, што Ён пачуе іхнія малітвы, нягледзячы на тое, што яны моляцца ціха ў зачыненым Вячэрніку.

І раптам... зашумеў у пакоі моцны вецер, і з'явіліся невядома адкуль агнявыя языкі над галовамі людзей... А ў іхніх душах запалілася вялікая радасць, тая, якую немагчыма трымаць у сабе, якой трэба дзяліцца з іншымі — тады яна пачынае расці і ахопліваць усіх... Вучні спявалі, танцавалі, гаварылі на розных мовах, радаваліся. Гэта было свята! Яны выбеглі вонкі... Там стаяў натоўп людзей, які хацеў зразумець, што ж адбываецца з гэтымі веселунамі? І тады Пётр пачаў прамаўляць да людзей. Ён упершыню ў жыцці гаварыў так шмат і так прыгожа! І... людзі паверылі яму, паверылі і ахрысціліся ў імя Езуса Хрыста! Так моцаю Духа Святога праз вучняў Езуса пачало распаўсюджвацца Евангелле.

...Калі суцішыш у сабе ўсё і будзеш размаўляць з Богам, магчыма, таксама аднойчы адчуеш, як Хтосьці дакрануся да тваіх думак і сэрца. Ты адчуеш радасць у сэрцы і бляск святла. Мабыць, ты ўжо здагадваешся, Хто ў такія хвіліны наведвае цябе...



Гульні Загадкі

Летні пейзаж

Дапасуй хмаркі і кветкі да пустых месцаў у летнім пейзажы. Чытаючы літаркі радамі, ты прачытаеш... пытанне, на якое трэба даць правільны адказ.

су пры ні ова ті

на ад час жа мо Хто

















Смяшынкі-весялінкі

Дыета

Святар распавядае дзецям пра цуд размнажэння хлеба і рыбаў.

— Пра што сведчыць тое, што пасля людзі набралі ажно 12 кашоў з астаткамі? — запытаў ён у дзяцей.

— Людзі баяліся папраўдзе і таму не з'елі ўсё. Мабыць, у іх была суровая дыета, — адказала Палінка.



Сябар

На ўроку біялогіі настаўнік пытае вучняў:

— Хто найлепшы чацверанногі сябар чалавека?

— Ложак, — адказаў Уладзік.

ЗАГАДКІ З ЕВАНГЕЛЛЯ

Сябры! Мы вельмі рады, што многія з вас ахвотна адгадваюць нашы «Загадкі з Евангелля». Некаторыя ўжо па некалькі разоў дасылаюць нам адказы. Часам здараюцца памылкі. Але ж гэта цалкам нармальна! Галоўнае, што вы шукаеце адказы на нашы пытанні ў самай мудрай кнізе — у Евангеллі. Ганна Быхавец з Полаччыны напісала нам, што дзякуючы гэтым загадкам яна навучылася карыстацца Бібліяй. Нас гэта вельмі парадавала, бо такую мы і ставім задачу. Асабліва нас радуюць тыя дзеці, якія прысылаюць адказы і на іншыя заданні часопіса.

З гэтага нумара мы вырашылі трохі ўскладніць «Загадкі з Евангелля». Дзеля таго, каб яны былі цікавейшыя. Так што будзьце ўважлівыя. Поспехаў!

Маленькі рыцар Беззаганнай

- Каго трэба баяцца хрысціяніну? (Ян 10, 26–33)
- Чаму памёр Ананія? (Дзеі 5, 1–5)
- Якую боязь называюць дарам Божым? (Катэхізіс Каталіцкага Касцёла)
- Ці правільна зрабіў Ірад, выканаўшы абяцанае? (Мк 6, 17–29)
- Кім стаў Стэфан пасля таго, як габрэі расправіліся з ім? (Дзеі 7, 54–60)
- Чаго баіцца д'ябал? (1П 5, 8–11)
- На якім моры адбыліся падзеі, апісаныя ў Евангеллі ад Лукі (8, 22–25)
- Чаму Езус выгнаў людзей са святыні? (Мц 21, 12–13)
- Што трэба, каб табе людзі прабачалі? (Мк 11, 25–26)
- Які чалавек па-сапраўднаму багаты? (Лк 12, 16–21)

Адказы на ***«Загадкі з Евангелля»,*** *змешчаныя ў № 1 за 2011 г.*

Даў сілу над дэманамі і аздараўляць хворых; дакрануцца да Езуса; вера; ускладаў рукі; 38 гадоў; цуды аздараўлення і вызвалення ад нячыстых духаў; зрабіўшы гразь і памазаўшы ёю вочы хворага; цешчай; начальнікам сінагогі; разабралі дах дома, у якім знаходзіўся Езус, і спусцілі да Яго хворага.


Узнагароды за дакладныя і поўныя адказы ад ксяндза Сяргея Сурыновіча атрымаюць: **Яна Ананька, Маша Лычкоўская, Ганна Быхавец** з Полацка, **Валерый Баліко, Улад Скур'ят, Юля Прошка, Міша Касцюкевіч, Вікторыя Вопручкава, Юля Юхневіч, Вераніка Пархуткіна, Сняжана** і **Таня Сапель** з Браслава, **Уладзік Адахоўскі** з в. Жвірына Браслаўскага р-на, **Мацвей Навойчык** і **Насця Падоба** з Наваполацка, **Міша Галубіхін, Ганна Ермакова** і **Яна Баброўская** з Чэрвеня, **Мікола Томкавіч** з Вілейкі.

Прыгоды ксяндза Лявона

Дзякуй, што нарадзіўся!

На касцельным пляцы садзілі кветкі, і ксёндз Лявон быў на сёмым небе ад радасці, бо працаваць прыйшло ажно 12 жанчын, пяцёра хлопцаў і дзяўчат дапамагалі ім. І нават тры мужчыны знайшліся ды ўзялі ў рукі рыдлёўкі. Словам, рабі-рабі ды папраўся!

Але ў самы разгар тае працы выйшла мітрэнга. Перад ксяндзом Лявонам, нібы аднекуль ці то з-пад зямлі, ці наадварот — з нябёсаў вырас хлопчык гадоў трох — ну зусім яшчэ не працаўнік. Тузануў малы ксяндза Лявона за сутану, задраў залацістую галоўку ўгору і радасна выгукнуў:



— Дзякуй табе, ксёндз Лявон, што я нала-дзіў-ся!

Запала ціша. Адно што вядро ў цёткі Алёны жаласна бразнула ды дзядзька Андрэй закашляўся раптам у кулак. Парушыў тую цішу ксёндз Лявон, бо некаму ж трэба было штосьці ўрэшце сказаць.

— А-а-а... адкуль жа ты, хлопча? Дзе твае мама з татам?

Але рызыка чамусьці вобмельгам пакінула хлопчыка, ён крутнуўся і пабег да брамы, а ад яе ўжо ішла маладая жанчына. Яна падхапіла малога на рукі, наблізілася з ім да ксяндза Лявона, заўсміхалася:

— Не памятаеце мяне? — І сама ж адказала: — Ну дзе вы там будзеце памятаць — у вас вунь колькі людзей штодня перад вачыма... Мы з вамі ехалі неяк у цягніку, тры гады таму... З Вілейкі ў Менск я ехала, плакала шмат ды паскардзілася вам на сваю бяду. Што дзіця маю пад сэрцам, а кватэры няма... І ўсё так кепска было тады ў мяне, так кепска... А вы, ксёндз Лявон, сказалі тады, што дзіця — гэта радасць і нельга наракаць на тое, што Бог паслаў яго, — жанчына засмяялася і гучна чмокнула сына ў шчаку: — Радасць ты мая! Вось мы і прыехалі... падзякаваць!

— А-а-а... дзе ж ваш... тата?

— У масыне! — ускрыкнуў пасмялелы хлопчык. — Ён у нас такі саламлівы — плоста стлах!

Хлопчыкавы словы патанулі ў смеху, а потым усе ўаднача з палёгкай загаманілі пра тое, як добра, як радасна гэта — дзякаваць за жыццё. Пані Міхаліна прынесла ксяндзу Лявону кубак вады, ён выпіў яго нагбом і сказаў малому:


— Я, ведаеш, таксама вельмі рады, што ты нарадзіўся!

Прыгоду запісала І. Ж.






Галерэйка




«У Кане Галілейскай».
Арцём Тумко,
г.п. Астравец.




«Маёвае».
Наташа Бобрык,
г. Наваполацк.



«Малітва».
Вераніка Гайдуковіч,
г.п. Астравец.



«Наш касцёл».
Уладзіслаў Балаш,
г. Вілейка.



«Аздараўленне».
Сямён Ромаш,
г.п. Астравец.





Алесь Пісьмянкоў

Неба, ластаўкі і я

Прагну свежасці і ветру,
Хай парушаць мой спакой,
Рэжце,
Ластаўкі,
Паветра,
Над распаранай зямлёй.
Раскудлаць ты,
Вецер,
Грушу,
Усхвалюй і растрывож.
Ну наплач мне,
Неба,
Лужу,
Каб пабегчы басанож.